Як ёсць, так ёсць

# ПТУШКІ ВЯРТАЮЦЦА Ў ГНЁЗДЫ СВАЕ, А ШТО Ж МЫ...

**Горад Браслаў. Аўтастанцыя. Дыялог ля касы: «Мне білет да Мілашак». — «Да Мілашак ці Бабылёў?» — удакладняе касір і мае рацыю. Калісьці гэта былі дзве розныя вёскі, паміж якімі, недзе насярэдзіне, на так званай граніцы, ляжаў вялізны валун. У час меліярацыі камень сцягнулі ў рачулку, што побач з дарогай, вёскі нібыта аб'ядналі назвай Мілашкі… Бабылі — гэта трохі далей, таму білет на аўтобус, на так званую малую радзіму, каштуе неаднолькава.**

А яна сама заўсёды ў памяці, заўсёды ў думках. У Мілашках, Бабылях нарадзілася і вырасла шмат адукаваных, таленавітых, прыстойных людзей — настаўнікаў, аграномаў, пагранічнікаў, інжынераў… І песня «Не прадавайце хату бацькоў» — гэта пра нас — пра мяне ды іншых патрыётаў вёскі, якія жывуць тут з вясны да позняй восені: насаджваюць кветак ды гародніны, змагаюцца з пустазеллем, у павазе да працы і зямлі выхоўваюць дзяцей ды ўнукаў, расказваюць пра мінулае жыццё і паходжанне назваў.

Паводле слоўнікаў, бабыль — бедны беззямельны селянін; адзінокі, чалавек без сям'і… Вёска (як, дарэчы, і Мілашкі) сапраўды знаходзіцца сярод лясоў — зямлі мала. Сюды, мусіць, не рваліся дзеўкі замуж? Адкуль і назва…

Што да Мілашак, то з імі, як лічыць мясцовы краязнаўца Леанід Ліноў, усё вельмі проста: прыгожае, мілае месца. Да вайны тут было 30 хат. Цяпер — прыкладна столькі ж. Сярод іх — досыць старыя, пабудаваныя ацалелымі франтавікамі на папялішчах (вёску падчас акупацыі спалілі немцы) і адносна новыя, што ўзвялі ўжо дзеці вяскоўцаў… Вылучаюцца дыхтоўныя двухпавярховыя гмахі. Іх — на месцах ранейшых хацін — узвялі так званыя мінчане сабе пад дачы.

На самай жа справе, дачнікі ў нас з розных месцаў, нават з суседняй Расіі. Хаты купляюць, можна сказаць, нарасхват — адбудоўваюць, даводзяць да ладу, ставяць новыя агароджы, наводзяць прыгажосць, бо яе патрабуе само гэта месца. Тут — чыстае паветра, цішыня, цудоўныя азёры, лес (да нас на паляванне нават з Францыі прыязджалі)… Словам, дзікая прырода, якая цяпер вельмі цэніцца.

У Мілашках карэнных жыхароў 16 (сем мужчын, дзевяць жанчын, дзяцей няма), у Бабылях — дзяцей трое, пенсіянераў — пяць, працаздольных — два.

Некалі раней тут была вялікая ферма, лясніцтва, магазін, школа-дзевяцігодка, ФАП, клуб, бібліятэка… З Браслава аўтобусы хадзілі кожны дзень, цяпер — двойчы на тыдзень... Як і аўтакрама.

Затое ў нас добрыя дарогі, ліхтары на слупах (раней, каб ноччу прайсці па вуліцы і не спэцкацца ў гразь, трэба было чапляцца за платы)...

Што да рэлігіі, то ў Бабылях жылі ў асноўным праваслаўныя, у Мілашках — католікі. Бліжэйшы касцёл — у вёсцы Далёкія, царква — у Богіна. Сваіх памерлых лясныя (у акрузе так называюць жыхароў гэтых вёсак) хаваюць на могілках у Замошы, Далёкіх або каля вёскі Бабылі.

У пачатку Мілашак, у якасці абярэга, стаіць каталіцкі крыж. Па вялікіх святах да яго, на малітву, сходзяцца вернікі. Быў час, калі яны збіраліся і маліліся ў сценах закрытай школы. (Вось такія парадоксы не тое гісторыі, не тое жыцця: спачатку вучняў пераконвалі, што рэлігія — гэта опіум для народа, потым аказалася — не…)

А народ, вяскоўцы, як ім не цяжка было, працавалі ў калгасе, гадавалі дзяцей, трымалі свае гаспадаркі. Кароў (іх у статак збіралася пад чатыры дзясяткі) пасвілі ў лесе. Там жа, на лясных палянах ля возера, месцічы касілі сена для сваіх рагуль. З добрых сенажацяў абодва ўкосы звозілі ў гумны калгаса… На подсціл зграбалі апалае лісце. За яго бліз пустуючай хаты гадоў 40 таму дзве жанчыны (сама была сведкай) ледзь не пабіліся.

Цяпер тых жанчын няма — сышлі ў лепшы свет, а лісця ўвосень — хоць заваліся. Яго падграбаюць так званыя дачнікі і спецмашыны дарожнікаў.

Мелі вяскоўцы і «соткі» (хто сорак, а хто і пяцьдзясят), шмат садзілі бульбы ды іншай гародніны… Многія самі сабе ды іншым шылі аддзенне і абутак, пляді кашы, ткалі, вязалі, вышывалі, выраблялі гаршкі.

Землі былі калгасныя. На іх сеялі лён (рвалі, дарэчы, уручную), садзілі ўсё тую ж бульбу, кукурузу, буракі...

Цяпер частка зямель адышла да Браслаўскага нацыянальнага парка: на іх гаспадарыць дзікі, ходзяць статкі ласёў… Сучасныя вяскоўцы гародніны амаль не садзяць, кароў ні ў кога няма. А вось сады — ёсць. Іх — маладыя — садзілі пасля вайны, і пакуль яны падрасталі, дзеці яблыкаў, можна сказаць, не бачылі. Цяпер — яны нікому не патрэбныя: у вёсцы іх ніхто не купляе, а ў Браслаў везці — транспарт не акупіш. У мяне вось сад пладаносіць праз год, і ў той, калі яблыкаў няма, я рада, а ў той, калі ёсць, збаліцца душа: прападаюць.

…Сусед Касцюк прывёз з Калінінграда плады каштана, пасадзіў. Выраслі магутныя дрэвы. А колькі ў нас дубоў, клёнаў, бяроз! Ну як не любавацца такой прыгажосцю?! Як не даражыць? Адзін з нашых вяскоўцаў жыў у Мурманску. Помню, пахаваўшы бацькоў, гаварыў, што дом нізавошта прадаваць не будзе, бо гэта ж Бацькаўшчына (!) Мы — тады маладыя — ледзь не смяяліся…

Разуменне і сум прыходзяць са сталасцю.

З гадамі, з часам і сапраўды вельмі шмат што мяняецца: вёскі — і пагатоў! Але ж хочацца, каб яны ў нас заставаліся, каб жылі! Помніце, у Скарыны: «Як ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і тым падобныя бароняць вуллі свае, — так і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены, да таго месца вялікую ласку маюць».

Мы ж, нашчадкі генія, чамусьці пакідаем і гнёзды свае, і віры, не спяшаемся бараніць вёскі — сваю радзіму і сваю зямлю! А добра было б памятаць: дзе нарадзіўся — там і спатрэбіўся.

**Ірына Філановіч,**
*г. Паставы.*

Весткі з месцаў

# «НАВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ»

**Пад такой назвай у нашай раённай бібліятэцы стартаваў літаратурна-патрыятычны марафон, зладжаны сумесна з Занальным дзяржаўным архівам.**



Бібліятэка прадставіла кніжную выставу «Хроніка Перамогі. 80-годдзе вызвалення». Там, на карце «Цытадэлі мужнасці», адлюстраваны 36 населеных пунктаў, якія сталі прыкладам баявых подзвігаў, усенароднага супраціўлення ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Літаратурная старонка прапанавала асобныя факты з ваеннай гісторыі гэтых гарадоў і пасёлкаў: прадстаўлены кнігі Сяргея Смірнова «Брэсцкая крэпасць», Мікалая Смірнова «Генерал Корж», Алеся Савіцкага «Обаль», Сяргея Панізніка «Асвейская трагедыя. 1943», іншыя дакументальныя і мастацкія творы, навінкі беларускіх выдавецтваў.

Дырэктар Занальнага дзяржаўнага архіва Ала Забелінская прэзентавала адмысловую выставу з трох блокаў дакументаў. У першым адлюстраваны пачатак вайны (трагічныя падзеі так званага "Навагрудскага катла", у якім апынуліся 11 дывізій армій Заходняга фронту), у другім — дакументы, прысвечаныя перыяду акупацыі раёна, калі было знішчана каля 45 тысяч яго жыхароў і каля 10 тысяч вывезена на прымусовыя работы, трэці блок расказвае аб перыядзе вызвалення...

Наша бібліятэка прэзентавала гісторыка-патрыятычную гульню-мемарыну «Вялікія сімвалы памяці Беларусі», дзякуючы якой юнакі і дзяўчаты ў інтэрактыўным фармаце пазнаёміліся з мемарыяламі — сапраўднымі сімваламі памяці беларускага народа.

**Святлана Чубрык,**
*г. Навагрудак.*

Прыклад

# Дарогу адолее той, хто ідзе

**На першы погляд сям'я ў нас самая звычайная: тата, мама, сын Мірон, дачка Мілана. Дзеці ходзяць у школу, бацькі — на работу... Усё, здавалася б, як і ва ўсіх ці ў многіх. Але ж ёсць адна асаблівасць, адно агульнае хобі.**

Усё пачалося восенню 2021 года, калі Мілана заявіла, што больш не хоча займацца танцамі, — хоча пайсці на каратэ.

Мы з жонкай, шчыра кажучы, здзівіліся такому выбару. А з іншага боку — чаму б і не, калі секцыя побач з домам, калі на занятках ходзяць многія (у тым ліку дзяўчаты), калі трэніруе іх Наталля Барысаўна Саўчанка, чэмпіёнка свету...

Праз два месяцы, гледзячы на заняткі сястры, у секцыю запісаўся сын.

Мы, бацькі, уважліва сачылі за іх дасягненнямі, радаваліся, што дзеці займаюцца спортам, удзельнічаюць у першых унутраных спаборніцтвах... І ў той жа час лавілі сябе на жаданні... стаць побач, займацца разам (у секцыі агульныя заняткі бацькоў і дзяцей — звычайная практыка).



У выніку я здаўся першым: пасля чарговых спаборніцтваў папрасіў прыняць мяне ў шэраг навучэнцаў. А далей...

Мы з дзецьмі займаліся тры, а то і чатыры разы на тыдзень. Трэніроўкі былі ўвечары, дадому вярталіся позна. Мама сумавала, хацела больш часу праводзіць з намі... Па гэтай прычыне яна таксама запісалася на каратэ і — як пасля прызналася — нават не чакала, што заняткі ёй так спадабаюцца.

Іншымі словамі, з верасня 2023 года ў секцыі мы займаемся разам, усёй сям'ёй, маем паясы (дзеці — зялёныя, я — аранжавы, мама — белы) і першыя дасягненні на рэспубліканскіх спаборніцтвах. Пералічваць іх не буду, хоць пахваліцца ёсць чым. Скажу толькі, што заняткі спортам — наша здароўе, наш выбар! Мы — разам! А далей — дарогу адолее той, хто ідзе.

**Вадзім Мохаў,**
*г. Мінск.*

Чалавек — чалавеку

# НЕ ТРЭБА КРЫЎДЗІЦЬ БАЛОТНЫХ...

**Штогод напрыканцы мая адзначаецца Сусветны дзень чарапахі. Навукоўцы налічваюць іх звыш трохсот відаў. У Беларусі жыве толькі адзін — чарапаха балотная.**

Мае сустрэчы з імі адбываліся ў асноўным на ўскраінах Гомеля (сажалкі па вуліцах Бельчанкі, Карастаянавай, праспекце Касманаўтаў. Асабісты рэкорд — восем балотных чарапах у адным і тым жа месцы. Праўда, раней яны былі смялейшыя — дазвалялі наблізіцца ледзь не на адлегласць выцягнутай рукі... У апошнія год ці два сталі больш асцярожныя. Што з'явілася таму прычынай, сказаць не магу, магчыма, людзі лавілі іх.

Што датычыцца дэкаратыўных чарапах, то найбольшай папулярнасцю ў гамяльчан і жыхароў раёна карыстаюцца чырванавухія, якія адносяцца да сямейства амерыканскіх прэснаводных. У майго стрыечнага брата падобная «тарціла» (памерам з невялікага пакаёвага сабаку) пражыла больш за 20 гадоў...

Дарэчы, некаторыя гора-гаспадары выпускаюць чырванавухіх чарапах у сажалкі, дзе тыя паспяхова размнажаюцца і, пазбаўляючы корму, нясуць пагрозу чарапахам балотным, занесеным, дарэчы, у Чырвоную кнігу!

А значыць, не трэба падобным чынам пазбаўляцца ад сваіх гадаванцаў — лепей аддаць іх новаму гаспадару альбо ў заапарк (у Мінскім і Жлобінскім я бачыў гэтых рэптылій).

**Максім Шастакоў,**
*г. Гомель.*